**УДК 398.332.16(476.5)**

# ЛАКАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ РУСАЛЬНАГА ТЫДНЯ НА ВІЦЕБСКІМ ПАДЗВІННІ

***канд. гіст. навук, дац. Т.І. КУХАРОНАК***
**Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск**

*На аснове сучасных экспедыцыйных і літаратурных матэрыялаў раскрываюцца рэгіянальна-лакальныя асаблівасці русальнай абраднасці на тэрыторыі Віцебскага Падзвіння. Выяўлены комплекс традыцыйных уяўленняў аб русалках, прыкметы, вераванні, забароны, якія тычацца некаторых відаў працоўнай дзейнасці і наведвання пэўных прыродных локусаў на працягу русальнага тыдня. Ахарактарызаваны святочна-абрадавы комплекс, прымеркаваны да завяршэння русальнага тыдня – Розгары, які быў распаўсюджаны на лакальнай тэрыторыі Дубровенскага раёна. Шырока прадстаўлены выказванні і меркаванні носьбітаў мясцовых каляндарна-абрадавых традыцый.*

Русальны тыдзень (“Кры(-і)вая нядзеля”, “Духаўская/ Русал(-ь)ная нядзеля”, “Русальніца”), які ў адпаведнасці з народным календаром беларусаў пачынаўся пасля свята Тройцы з панядзелка (Сашэсце Святога Духа), на Віцебскім Падзвінні адзначаўся на усходняй тэрыторыі. У некаторых лакальных традыцыях зафіксавана прымеркаванасць русальнага тыдня да траецка-купальска-пятроўскага перыяду: “Духа ж празнавалі тры дні: воскресенье, панядзельнік і аўторнік, а среда, чецверьг, пятніца, субота – эта ўжэ Русальніца, а тады уже васкресенне – эта дзень святы, Русальніца кончылась” (в. Міхалінава, Лёзненскі раён); “Русалкі бываюць толькі адну нядзелю перад Тройцай” (в. Пруднікі, Гарадоцкі раён); “Русалкі, гаворуць, як жыта красуецца, Купала во гэта, тады русалкі” (в. Трасцянка, Талочынскі раён).

Паводле традыцыйных беларускіх, а шырэй славянскіх вераванняў, русальны тыдзень з’яўляўся надзвычай шкодным, “крывым” часам (пагроза “крывізны” для чалавека, жывёл, расліннасці ў выніку парушэння перасцярог і забарон). Па гэтай прычыне мясцовыя жыхары, як і вяскоўцы паўсюль на Беларусі, вельмі шанавалі азначаны тыдзень, не пачыналі ніякай новай работы, не пралі, не ткалі, не вілі вяровак, не капалі зямлю, не гарадзілі платоў, не часалі колле, каб у гаспадарцы не здарылася якога-небудзь няшчасця, а таксама не нарадзіліся калекамі дзеці ці жывёла: “Тады, як Русальная нядзеля, нічогачкі ня дзелаюць. Таксама Духа бальшой празьнік, Тройца эта, на первый день абязацельна нада, каб празнавалі, печку не тапілі, гатовілі ўсю яду ў суботу вечарам, саблюдалі празьнік. Асобенна, еслі сама жэншчына пузатая, то нічога нільзя дзелаць. Еслі скот цельны ў хляве – уроды родзюцца” (Кацярына Калініна, 1924 г.н., в. Ляды, Дубровенскі раён. Зап. Т. Валодзінай, Т.Кухаронак, 2015 г.); “Крівая нядзеля после Тройцы. Казалі грех бальшэй дужа, калі зацясывалі згароду, зацясывалі колікі якія. Ні рубіць, ні резаць, ні шыць нельзя целую нядзелю. У нас быў случай такей. <Адна жанчына> мне сама расказывала. Яна гаворіць: “Фёдар, ні цяшы ты колікі”, – крівая нядзеля была тады. А ён уся раўно, пашоў і зацясаў. І радзілась дзевачка з адной ножкай, і зацесана, точна колічак. Людзі, каторыя панімаюць, саблюдаюць еты закон” (в. Засценкі, Дубровенскі раён) [1, с. 766]; “На Русальніцу нельзя садзіць курыцу, а то вывядуцца цыплята калекі” (Ганна Враб’ёва, 1932 г.н., в. Кляўцы, Лёзненскі раён. Зап. Т. Кухаронак, 1999 г.). Забаранялася купацца і мыць бялізну: “На Русальніцу нільзя было адзежу мыць у речке, а то русалка спаймае і ўтопіць чалавека” (Таццяна Зайцава, 1910 г.н., в. Пушкі, Лёзненскі раён. Зап. Т. Кухаронак, 1999 г.).

Сустракалася прадпісанне для жанчын не хадзіць у гэты перыяд з непакрытай галавой, бо русалкі могуць пакараць: “Яны <русалкі> такія цаплятыя, рагатыя, яны цапаюцца дажа ў валасы дзеўкам, што ходзяць у цвяты ў жыта. <…> Яна ляціць, на цябе садзіцца, у валасы ўчэпіцца… За тое без платкоў дзеўкам ету <русальную> нядзелю нельзя хадзіць – яна ўчэпіцца ў валасы. <…> Яна дужа не царапаецца, каб да крыві, яна путаець валасы. <…> Ена сядзець на галаву табе і будзець гнездзіцца на галаве. Гаво-ряць, тыя воласы ўсе вылязуць, у каго яна сядзець, на той галаве валасы ўжэ ня вырастуць” (в. Пруднікі, Гарадоцкі раён) [1, с. 114]. “І з голай галавой хадзіць нельзя было. Ну вабшчэ тады не хадзілі без платкоў. Ну, русалка-та кувакала, і што русалка ўпляцецца ў валасы. Магла і на галаву ўзляцець” (в. Заронава, Віцебскі раён) [2, с. 239]. Адзінкавыя запісы фіксуюць забарону адносна шлюбаў і сямейнага жыцця: “На Русальніцу замуж нільзя выхадзіць – ні павязёць у жызні, будзець плахая жызнь” (в. Міхалінава, Лёзненскі раён) [1, с. 115].

Гэта быў перыяд найбольшай актыўнасці русалак. Русалкі ў беларускім фальклоры і вераваннях выпісаны надзвычай ярка і выразна, але яны настолькі розныя, што, як слушна адзначаюць беларускія фалькларысты, часта іх можна ідэнтыфікаваць як адзіны вобраз толькі па агульным найменні-міфоніму – *русалкі*. У адрозненне ад іншых духаў прыроды і гаспадаркі ў русалак няма прывязкі да пэўнага месца пражывання: яны могуць сустракацца ў полі, у вадзе, у лесе, на могілках, у агародах, лугах, садах, а пры пэўных абставінах і ў дварах, лазнях, вясковых хатах [2, с. 232]. У аповедах жыхароў Віцебскага

Падзвіння часцей за ўсё месцамі знаходжання русалак называюцца лугі, жытнёвае поле, дрэвы, рэкі, азёры ("вада"): "Старыя людзі гаварылі пра русалак, каторыя відзелі етых русалак, што яны хадзілі па лугам" (Раіса Нікіценка, 1935 г.н., в. Арловічы, Дубровенскі раён. Зап. Т. Валодзінай, Т. Кухаронак, 2015 г.); "Бывала, кажуць, ходзюць русалкі, ай, ета ат веку вякоў было, у жыці яны ходзюць" (в. Станіславава, Дубровенскі раён) [1, с. 115]; "Яны жывуць, дзе вада – ў речке" (Ганна Вераб'ёва, 1932 г.н., в. Кляўцы, Лёзненскі раён. Зап. Т.Кухаронак, 1999 г.); "После Духа русальная нядзеля пачынаецца, у ета ўремя русалкі бегаюць па жыту" (Таццяна Зайцава, 1910 г.н., в. Пушкі, Лёзненскі раён. Зап. Т. Кухаронак, 1999 г.); "Русалкі па жыту ходзюць, валасамі апушчаныя" (Соф'я Ступак, 1926 г.н., в. Лаўрэнаўка, Талочынскі раён. Зап. Т. Валодзінай, 2007 г.); "Жывець у вадзе русалка" (Марыя Саўчанка, 1928 г.н., в. Рудня, Расонскі раён. Зап.Т. Валодзінай, У. Лобачам, 2007 г.); "Маі дзевяры відзелі русалку на бярёзе, а адкуль яна явілася яны ж ня відзелі. Яна на макушке на бярёзе калыхалася і пела" (в. Міхалінава, Лёзненскі раён) [1, с. 115].

Русалкі могуць выглядаць антрапаморфна (як дзеці, маладыя дзяўчыны, жанчыны з малымі дзецьмі, старыя бабы), зааморфна (як істоты, падобныя на птушку, малпу, змяю, ката, пацука, няпэўнага "звярка" і да т. п.), мець шэраг інфернальных прызнакаў, жалезныя і іншыя штучныя часткі цела [2, с. 232]. У фальклорных тэкстах, якія адлюстроўваюць знешні выгляд русалак на тэрыторыі Віцебскага Падзвіння, узгадваюцца амаль усе іх "тыпы", аднак найбольш распаўсюджаны антрапаморфныя: "У старае ўремя былі русалкі, ета маладыя дзяўчонкі з дліннымі валасамі" (Таццяна Зайцава, 1910 г.н., в. Пушкі, Лёзненскі раён. Зап. Т. Кухаронак, 1999 г.); "Баба русалка ці дзеўка, но ні мужчына" (в. Пнёва, Лёзненскі раён) [2, с.235]. Многія запісы фіксуюць галізну русалак або апранутасць "да паловы", пры тым голымі русалкі маглі паказвацца ва ўсіх асноўных месцах свайго знаходжання – у жыце, у лесе, у вадзе: "У іх валасы длінныя і голыя яны хадзілі" (в. Пнёва, Лёзненскі раён) [2, с. 246]. "Глядзяць, а на тэй даске стаяць чатыры дзеўкі голыя, як маць радзіла і калышуцца. <…> Косы ў іх да самых пят, у каторай чорныя, у каторай русыя" (в. Сялішча, Лёзненскі раён). Часта русалкі мелі крылы: "Во русалка, яна літаіць вродзе чым-та, крыллямі. <*А гэта птушка ці баба якая*?> Гэта вродзе як чалавек. Ну а на самам дзеле – хто яе знаіць" (в. Перавоз, Расонскі раён) [2, с. 251,254].

Нярэдка інфарманты вобраз русалкі з крыламі дамалёўвалі яшчэ і хвастом: "Длінныя валасы, а хвост рыбій. І з крыльямі… Да. І крылья, і хвост рыбій. І лятала, і ў вадзе была яна. <*Так русалкі маглі і ў вадзе вадзіцца*…> І па дзяреўях лазіць. Мама гаваріла так" (в. Заронава, Віцебскі раён) [2, с. 251].

На даследуемай тэрыторыі сустракаюцца і аповеды пра русалак зааморфнага выгляду: "Русалка – як птушка бальшая. Русалка такей, як птушка, яна пахожа на птушку. У іх валасоў німа, у іх перья, як у ястреба-луні, шэрае. Адзін раз паймалі яе, дак у яе кіпці бальшые, загібістые" (в. Пруднікі, Гарадоцкі раён) [1, с. 114]; "Русалкі, гаворуць, касматыя, галовы абросшыя" (Раіса Падабед, 1923 г.н., в. Трасцянка, Талочынскі раён. Зап. Т. Валодзінай, 2007 г.); "Яна як кот ета русалка" (Таццяна Зайцава, 1910 г.н., в. Пушкі, Лёзненскі раён. Зап. Т. Кухаронак, 1999 г.); "Кажуць, <русалкі> на абезьяну пахожыя" ) (в. Валова Гара, Лепельскі раён) [2, с. 258].

У некаторых лакальных традыцыях русалкі мелі незвычайны выгляд, які цяжка паддаецца апісанню: "Чорт іх знаець, тыя русалкі: такія як мятла лёталі, такім агнём свяцілі. Вот. Па вярху, метраў пяцьдзесят. Ну, русалкі такія, як мётла. Вы ж знаеця мятлу?" (Васіль Ермаловіч, 1919 г.н., в. Серкавіцы, Талочынскі раён. Зап. Т. Валодзінай, 2007 г.).

Для даследуемай тэрыторыі найболей характэрна ўзгадванне пра русалак, акцыянальная праява якіх заўсёды негатыўная, небяспечная ў адносінах да людзей: "Раньше, бувала гаворуць, русалкі ходзюць, ловюць людзей, мужчын, закручываюць валасамі кругом шыі і давяць" (в. Пнёва, Лёзненскі раён); "Кажуць, абложуць, будуць шчакатаць, пакуль ня кончыцца, а тады п'юць іхную кроў. <*Яшчэ і кроў п'юць*?> Ага. <*А русалкі нячыстая сіла ці не?*> Канешне, раз яны проціў людзей!" (в. Валова Гара, Лепельскі раён) [2, с. 258]. "У русальную нядзелю кажуць: "Не хадзіце ў жыта, а то русалкі задавяць". Могуць паймаюць чалавека і задавіць" (Таццяна Зайцава, 1910 г.н., в. Пушкі, Лёзненскі раён. Зап. Т. Кухаронак, 1999 г.); "У лес нільзя хадзіць, а то русалка задавіць. Гаворадь, яна на чалавека прыгала і душыла яго, увечары" (Ганна Вераб'ёва, 1932 г.н., в. Кляўцы, Лёзненскі раён. Зап. Т. Кухаронак, 1999 г.); "Русалкі – эта чэрці хадзілі, нячыстая сіла, яны сільна врядзілі людзям, то пераяпугаюць каго, то навредзяць, здзелаюць што" (в. Міхалінава, Лёзненскі раён) [1, с. 115].

У расказах мясцовых носьбітаў традыцый, запісаных у апошняе дзесяцігоддзе, найбольш поўна гэты міфалагічны персанаж прадстаўлены як адзін з галоўных вобразаў для застрашвання дзяцей: "Дзяцей пужалі імі, калі шлі васількі рваць, штоб жыта не ламалі" (Таццяна Макарава, 1923 г. н., в. Станіслававa, Дубровенскі раён) [1, с. 115]. "Рабятам казалі: русалка зарябэць. Русалкі ў жыці, цябе зловюць, паганяюць" (Васіль Ермаловіч, 1919 г.н., в. Серкавіцы, Талочынскі раён. Зап. Т. Валодзінай, 2007 г.); "Яны страшныя, мы баяліся дужа кала ржы той іці. Я спрашывала ў сваіх радзіцеляў: "Када тая нядзеля русалная?" Тады не хадзілі мы кала ржы" (Ксенія Раманенка, 1925 г.н., в. Буда, Дубровенскі раён. Зап. Т. Валодзінай, Т. Кухаронак, 2015 г.); "Гаворуць русалкі ходзюць па жыту. Ну пужалі ж,

<што> можа, будуць душыць” (Раіса Падабед, 1923 г.н., в. Трасцянка, Талочынскі раён. Зап. Т. Валодзінай, 2007 г.); “Баяліся ў рож хадзіць, там русалкі жывуць і ловюць дзіцей. Уловіць, пашчакочыць” (Марыя Багамолава, 1918 г.н., в. Парэхі, Лёзненскі раён. Зап. Т. Кухаронак, 1999 г.); “Ну, пра русалак. Гэта калі бягуць рабяты гэтыя, мы просімся купацца. А нам гавораць, што яшчэ нільзя, русалка ходзіць у вадзе, яшчэ нільзя. Тады схваціць. – А як? Тады бабушка кажыць: “А русалка такая, што жывець у вадзе, і вот еслі табе нільзя, мама не пускаіць, а ты просісся, ідзеш, а яна цябе за нагу і ўсё”. Баісся, да смерці баяліся” (Марыя Саўчанка, 1928 г.н., в. Рудня, Расонскі раён. Зап. Т. Валодзінай, У. Лобача, 2007 г.); “А бацькі на рабоце і не хацелі, каб мы далёка хадзілі, і пужалі нас русалкамі. Казалі, што яны – такія высокія дзевачкі, ручкі тоненькія, валоскі длінныя, глазкі галубенькія, зубкі востранькія, і когцікі востранькія. І вот, яны як схвацяць, дык будуць шчыкатаць і будуць так шчыкатаць, што пamрэш” (в. Шо, Глыбоцкі раён) [2, с. 255].

Да найбольш яскравых прыкладаў захавання лакальнай своеасаблівасці трэба аднесці комплекс абрадаў, звычаяў, вераванняў, прымеркаваных да заканчэння русальнага тыдня, – *Розгары*, якія на даследуемай тэрыторыі адзначалі ў панядзелак паслятраецкага тыдня: “Розгары – ета бываець Троіца, Духа, тады нядзеля пройдзець, васкрасенне, а ў панядзелак – Розгары” (в. Міхалінава, Дубровенскі раён). Розгары былі распаўсюджаны пераважна на Дубровеншчыне і мелі там некалькі варыянтаў правядзення. Найбольшая колькасць успамінаў апытаных інфармантаў прысвечана гулянню жанчын – “чапляць калодкі” мужчынам, каб атрымаць ад іх выкуп за вызваленне, якое праходзіла падобна на аналагічнае гулянне масленічнага перыяда (і Масленіца, і Русальны тыдзень з’яўляюцца прамежкавым часам паміж сезонамі). “Ета Розгары ў нас так былі, после Духа. Вот сабіраюцца жэншчыны, сёння Розгары, будзем цягаць калодкі. Сдзелаем калодку такую, за вяpёўку зацэпім, па(-у)падзем мужчыну – і во за етым мужчынам. Няхай жанаты, няхай старый, няхай маладый – хто папаўся пад рукі, таму і пацэпім калодку. Ён уцякаець, а мы – за ім. Дагонім яго, калодку ету на шыю павесім – расчытуйся! Ну, і ўсё – расчытаецца, дась нам на бутылку. У нас харошыя бабкі былі, вып’ем па рюмке, па дзве, сколька хто пасіліць, мы і яго ўгасцім. Так і гулялі калодку” (Зінаіда Мядзьведзева, 1935 г.н., г. Дуброўна. Зап. Т. Валодзінай, Т. Кухаронак, 2015 г.); “Гулялі Розгары, я гуляла, хоць і маладая была. – “Ну, што, – бабы скажуць, – як бы каму калодку пачапіць?” Я кажу: “Дак німа каму”. А ў нас на балоце работалі трактарысты, вазілі торф. І я аднаго знала як завуць. І на тое ліха, ідзець той трактарыст па вуліцы. А бабы кажуць: “Тамара, бягом!” А ён ужо праходзіць. Я яго дагнала, за шыю абшчапіла. – “А што ета такое? – ён пытаець. – Калодка табе, нясі, ці плаці. – А чым плаціць? – Чым хочаш. – Ну, ладна, – кажэць, – заплачу”. Заплаціў. А тады кажэць: “А дзе вы гуляеце?” – А во тут, у Марусі гуляем”. Ну, што, прыгласілі мы яго, прышоў ён, нам даў на дзве бутылкі. Гулялі, ён кажэць: “Маладцы, бабкі, што вы мяне ўлавілі. Я ж, – кажэць, – ня думаў, а папаў к вам”. А я яшчэ ўзяла ды на тыя Розгары заатэхніку пачапіла калодку, а заацехнік быў прыезджы. Ён ідзець на ферму, і я ж на ферме работала. Бабы кажуць: “Тамара, чапай ты яму калодку”. Я абратна, хусцінку з галавы і яму на шыю: “Максімавіч, што ты абычая нашага ня знаеш? – А што такое, што за абычай?” Но ён не дзерявенскі малец, канешне. Ну, ён праўда, заплаціў” (Тамара Прышчэпава, 1932 г.н., в. Міхалінава, Дубровенскі раён. Зап. Т. Валодзінай, Т.Кухаронак, 2015 г.); “После Духа Розгары, абыкнавенна, сабярёмся бабы, закускі, гарелкі, на полі сядзем, вып’ем і пяём – ета Розгары” (Праскоўя Новікава, 1928 г.н., в. Ляхаўка, Дубровенскі раён. Зап. Т.Валодзінай, Т.Кухаронак, 2015 г.). Часта гулянне жанчын дапаўнялася іх пераапрананнем і маскіраваннем: “Русалкі хадзілі. Хадзілі адзін дзень, за нядзелю Тройцы – русалная нядзеля. Бабкі нарядзяцца, валасы распусцяць, страшныя такія! Пападзіся ім, яны шчакочуць, а мы ж баялісь шчакоткі, ай-ай-ай! Мы ўцякалі. Да, параспускаюць <жанчыны> валасы, надзенуць штаны і ходзюць, дзяцей пужаюць, лавілі ўсіх, асобенна мужчын. І бутылка ў іх з водкай ілі з віном на шыі. Тады пы(-а)ймаюць мужыка і яму вешаюць ету бутылку – давай грошы і ўсё! Ну, даюць жа грошы, аткупліваюцца. Тады сабіраюцца, гуляюць і выпіваюць” (Ксенія Раманенка, 1925 г.н., в. Буда, Дубровенскі раён. Зап. Т. Валодзінай, Т. Кухаронак, 2015 г.). Аналагічныя абрады і звесткі пра гульні пераапранутых на Тройцу фіксуюць расійскія фалькларысты на Пскоўшчыне: “Женщины зделаютца на какую-нибудь чучелу и ходють. И ведьмый назавуть, и русалкай назавуть – всяка. Валаса распустють, лахмата аде нитца и глядить – што русалка или ведьма здесь. Па улицы так – вроди страх наводють, што вот яна ведьма… Так страшна, што на улицы ни усидеть” [3, с. 209].

У Дубровенскім раёне са слоў былога дырэктара раённага метадычнага цэнтра Дубровенскага аддзела культуры А.М. Красоўскай, зафіксаваны звесткі аб святкаванні Розгараў выключна бяздзетнымі жанчынамі: “У нас ёсць такое свята – Розгары. Яно святкуецца после Троіцкай нядзелі ў панядзелак, гэта бабскае свята. Яго святкавалі жанчыны, каторыя ні маглі нарадзіць дзіця. После абеда яны тапілі лазню, рвалі крапіву на венікі і ішлі ў лазню. Гэтымі венікамі парыліся, потым збіраліся, бралі з сабой яду, гарэлку і ішлі на край поля, дзе жыта расце, там садзіліся, елі, выпівалі, потым браліся парамі і качаліся па жыце. Калі жанчыны вярталіся з поля і сустракалі мужчыну, яны пачыналі лавіць яго, шуткавалі так. Калі зловяць – мужчына павінен быў адкупіцца. Тады яны заходзілі к каму-небудзь у хату і працягвалі сваё гулянне. Гэтак спраўлялі Розгары ў вёсках Баева, Ірвяніца, Сваташыцы. Яшчэ бабулі мне расказвалі,

PolotskSU

што ў гэты дзень паміналі "скідышаў", памёршых неданошаных няхрышчаных дзяцей" (Зап. Т. Валодзінай, Т. Кухаронак, 2015 г.). У сувязі з гэтымі звесткамі цікавымі падаюцца аналогіі з карпацкай зоны: "В селе Замагоры Верховинского района Ивано-Франковской области зафиксированы народные поверья и предписания, связанные с понедельником после Троицы (*Розигри*), в соответствии с которыми женщине, у которой умер некрещеный ребенок (вариант: у которой был выкидыш) запрещалось в этот день спать (вариант: нужно было обязательно немного поспать), иначе будет слышать плач умершего некрещеным ребенка" [4, с. 65–66].

У некаторых вёсках даследуемай тэрыторыі Віцебскага Падзвіння інфарманты ўспамінаюць, што провады русалкі ажыццяўляла толькі моладзь: "Вечарам на Розгары, калі вялі русалку, збіралася моладзь з усіх вёсак. Выбіралі месца ў жыце на перакрыжаванні. Там палілі вогнішча, рабілі факелы" (в. Вяцера, Чашніцкі раён)[1].

Такім чынам, аналіз наяўнай інфармацыі дазваляе зрабіць наступныя вывады. Звычаёвасць і абраднасць Русальнага тыдня ў даследуемым арэале, маючы шэраг агульнабеларускіх адпаведнікаў, заўважна вылучаецца своеасаблівымі лакальнымі адметнасцямі, да якіх у першую чаргу адносяцца: высокая частотнасць вераванняў аб небяспецы для патомства, непазбежным пакаранні за парушэнне забаронаў на працу і прынятых правіл паводзін у адносінах і камунікацыі паміж людзьмі і міфалагічнымі персанажамі – русалкамі, якія асабліва актывізаваліся падчас гэтага перыяда народнага календара мясцовых жыхароў; святочна-абрадавы комплекс, прымеркаваны да заканчэння русальнага тыдня – *Розгары* – сканцэнтраваны на тэрыторыі Дубровенскага раёна.

ЛІТАРАТУРА


1. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / Т.Б. Варфаламеева [і інш.] ; склад. Т.Б. Варфаламеева. – Мінск : Бел навука, 2004. – Т. 2. Віцебскае Падзвінне. – 910 с.
2. Цімафей Авілін, Мікалай Антропаў, Алена Боганева. Русалкі: знешні выгляд // Беларускі фальклор. Матэрыялы і даследаванні : зб. навук. прац. – Мінск : Беларуская навука, 2016 – Вып. 3. – С. 232–274.
3. Народная традиционная культура Псковской области. Обзор экспедиционных материалов : в 2 т. / авт. проекта, сост., науч. ред. А.М. Мехнецов. – СПб. ; Псков : ОЦНТ, 2002.– Т. 1. – 688 с.
4. Плотникова, А.А. Праздник Троицы по материалам полевых этнолингвистических исследований в карпато-балканской зоне // Троица… К мотиву зеленого в балканском спектре : материалы круглого стола, 17 апр. 2012 г. – М., 2013. – 190 с. – С.59–77.


## LOCAL FEATURES MERMAID RITES OF THE WESTERN DVINA BASIN

***T. CUHARONAK***

*On the basis of today's expeditionary and literary materials disclosed regional and local features mermaid rites of the Western Dvina basin. The complex of traditional ideas about mermaids, signs, beliefs, prohibitions on certain types of work and visits to certain natural loci for mermaid week. Described festive and ritual complex, dated to the end of the week mermaid – Rozgary circulated in the local territory of Dubrovno district. Widely presented statements and judgments of local media calendar and ceremonial traditions.*

[1] Беларускі фальклорна-этналінгвістычны атлас Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.



PolotskSU